Событие



## Время и слово

Информационные атаки, травля журналистов государственных СМИ, недостоверные новости... Работу в эпоху новых медиа обсудили делегаты съезда Белорусского союза журналистов

с. 5

Образование

## Светло, как днем



В Утевской СШ установили панель для преобразования солнечной энергии в электрическую

с. 6

Раённая масавая газета. Заснавана 24 сакавіка 1935 года

# ДОБРУШСКІ КРАЙ

№92 (11010) Субота 28 лістапада 2020 года

# Калі прафесія – прызванне



## У раёне адзначылі лепшых аграрыяў і жывёлаводаў

Кіраўнік мясцовай улады Дзмітрый Козел падзякаваў прадстаўнікам сельскагаспадарчай галіны раёна за шчырую працу з нагоды іх нядаўняга прафесійнага свята. На афіцыйнае мерапрыемства ў райвыканкам запрасілі лепшых аграрыяў і жывёлаводаў.

Ганаровыя граматы, Удзячнасці аблвыканкама, камітэта сельскай гаспадаркі і харчавання, раённага выканаўчага камітэта, райсельгасхарчу атрымалі 16 работнікаў сельгаспрадпрыемстваў раёна. Сярод іх – трактарысты, аператары машыннага даення, камбайнеры, галоўныя спецыялісты гаспадарак. Іх аб'яднала не толькі прафесія, але і адданасць, з якой яны выконваюць свае абавязкі.

Бездакорнае выкананне службовых абавязкаў стала нагодай для ўручэння ўзнагарод і супрацоўнікам раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях. Так, Ганаровую грамату райвыканкама атрымаў першы намеснік начальніка райаддзела Міхаіл Лысоў, а Ганаровую грамату райсавета дэпутатаў старшыня райвыканкама ўручыў старшаму інжынеру райаддзела Ігару Адзіночанку.

**Фота Яўгена УСЦІНАВА**

ISSN 2073-1000

**погода**

Долгота дня 7.54
Луна
28, 29 ноября – в Тельце,
30 – в Близнецах

Полнолуние
30 ноября

**29 ноября**
НОЧЬЮ 0…+2
ДНЕМ 0…+2
Сплошная облачность.
Мокрый снег.
Ветер ю.-западный 1-3 м/с.

**30 ноября**
НОЧЬЮ около 0
ДНЕМ около 0
Сплошная облачность.
Небольшой снег.
Ветер ю.-западный 3-5 м/с.

В ЦЕНТРЕ ВНИМАНИЯ

# Совпадение интересов

## Экономика, сотрудничество во внешней политике и международная проблематика. Какие еще вопросы обсудил Президент с министром иностранных дел России?

**Отношения Беларуси и России нуждаются не в перезагрузке, а в интенсификации. Об этом Президент Беларуси Александр Лукашенко заявил на встрече с министром иностранных дел России Сергеем Лавровым.**

Александр Лукашенко отметил, что сейчас ведется очень много разговоров о том, как будут развиваться отношения двух стран, и подчеркнул стремление Беларуси сохранять тесное взаимодействие с Россией. «Мы бы хотели иметь не просто добрососедские отношения, мы хотели бы иметь очень близкие, братские отношения с Российской Федерацией», – заверил Президент.

У Беларуси и России полностью совпадает заинтересованность в укреплении отношений. Об этом заявил министр иностранных дел России Сергей Лавров.

«Прежде всего, привет вам от Владимира Владимировича. Он подтвердил все, о чем вы договорились с ним прежде, особенно в Сочи. У нас полностью совпадает заинтересованность в укреплении отношений. Можно это по-разному называть, но у нас та же самая цель: продвигаться к взаимной выгоде наших народов, стран и Союзного государства», – подчеркнул Сергей Лавров.



Руководитель российского МИД напомнил, что ранее Глава белорусского государства выступил с несколькими инициативами. Они, по мнению министра, очень важны для белорусского общества. «Как не раз подчеркивал Президент Путин, мы заинтересованы в том, чтобы эти инициативы состоялись. Если что-то можем сделать в их поддержку, мы всегда открыты для этого», – добавил Сергей Лавров.

Министр иностранных дел России Сергей Лавров прибыл в Минск с рабочим визитом. Уже прошла его встреча с главой МИД Беларуси Владимиром Макеем. Состоялось и совместное заседание коллегий министерств иностранных дел Беларуси и России.

В числе вопросов, которые рассмотрены на заседании, – координация действий в международных организациях, ЕАЭС, ОДКБ, СНГ. Затронуты состояние отношений с Евросоюзом, возможности участия ОДКБ в операциях ООН по поддержанию мира, перспективы формирования Большого евразийского партнерства через сопряжение интеграционных процессов, а также взаимодействие в сфере международной информационной безопасности.

По итогам заседания подписан ряд совместных документов, включая план межмидовских консультаций на 2021 год и постановление коллегий, в котором найдет отражение проблематика договоренностей по рассмотренным вопросам.

**По материалам БелТА**

НОВОСТИ РЕГИОНА

# Выплаты контролирует профсоюз

## В медучреждениях области в этом году создано 8 первичек

Сфера здравоохранения региона насчитывает 155 профсоюзных первичек, в том числе 40 – в организациях негосударственной формы собственности.

В пресс-службе профсоюза отметили, что из-за эпидемиологической ситуации изменились условия труда практически всех работников учреждений здравоохранения. На особом контроле находится реализация нанимателями норм Указа №131 «О материальном стимулировании работников здравоохранения», а также разрешение возникающих вопросов по его применению.

Так, на выплату надбавки за работу в условиях, связанных с инфекциями, работникам здравоохранения бюджетных организаций Гомельской области в апреле – сентябре направлено почти 39 млн рублей. В профсоюзе подчеркнули, что эта работа продолжается.

**По материалам СМИ**

НА СВЯЗИ

**30 ноября с 10.00 до 12.00 по телефону 3-12-48**
пройдет прямая телефонная линия с участием Владислава Гисматовича ГАСЫМОВА, начальника отдела внутренних дел райисполкома.

СУСТРЭЧА

# ШАГ арыентаваны на канструктыў

## Журналісты «ДК» сталі гасцямі добрушскіх школьнікаў




Гутарка з кіраўніком «Добрушскага краю» атрымалася цікавай

*Маленькая рэмарка. Дыялог журналістаў «Добрушскага краю» з вучнямі СШ №2 імя Фёдара Кухарава на чарговых занятках праекту школы актыўнага грамадзяніна (ШАГ) адбыўся ў абсталяваным «па апошнім слове» кабінеце хіміі. Між тым, у зацікаўленай гутарцы аб сітуацыі ў медыяпрасторы краіны і замежжа яе ўдзельнікі былі дастаткова шчырымі. Ніякай «хіміі», як кажуць!*

І ў тым, зразумела, немалая заслуга арганізатараў: настаўніц беларускай і рускай мовы і літаратуры – адпаведна Алесі Кананок і Юліі Далбенка, а таксама старанных вядучых дзевяцікласніц Насці Несцеравай і Юліі Чарновай.

> ✓ Булінг, кібермахлярства і размяшчэнне небяспечнага кантэнту ў сетцы інтэрнэт пабуджае прымаць сур'ёзныя меры да забеспячэння інфармацыйнай бяспекі маладога пакалення.

Галоўны рэдактар «ДК» Мікалай Ждановіч расказаў прысутным 9-ці і 10-класнікам аб выданнях, якія дзейнічаюць на інфармацыйным полі, працэсах, што адбываюцца сёння ў медыяасяроддзі. Не сакрэт, што насуперак усталяваным канонам падачы журналісцкага кантэнту, дзе на першым месцы заўжды былі прыстойнасць, інтэлігентнасць і прафесійны этыкет, тут з'явіліся амбіцыёзныя паліттэхнолагі і прыхільнікі фэйкаў і гарачых, настоеных на паўпраўдзе, навін.

І на гэтым фоне барацьба за людскія розумы на медыяпрасторы разгарнулася сур'ёзная. Іў арбіту гэтага супрацьстаяння нярэдка ўцягваецца моладзь, не заўсёды здольная правільна ацаніць рэаліі. З'явіўся нават тэрмін – грумінг, які азначае ўсталяванне анлайн-кантактаў з непаўнагадовымі з мэтай іх далейшай сэксуальнай і псіхалагічнай эксплуатацыі.

«А як сябруюць з новымі інфармацыйнымі тэхналогіямі журналісты раёнкі?», «Якія спосабы выкарыстоўваюць газетчыкі ў пошуку і праверцы інфармацыі, якая размяшчаецца ў выданні?» – гэтыя і іншыя пытанні школьнікі задалі кіраўніку «ДК» пасля азнаямлення аўдыторыі з першымі і сённяшнімі нумарамі райгазеты. Перамена відавочная, заўважылі старшакласнікі. А хтосьці з іх нават заявіў: папрашу бацькоў падпісацца...

Педагогі, арганізатары мерапрыемства – з паказам відэафільма аб перасцярогах для падлеткаў пры наведванні інтэрнэт-сайтаў на мульцібордзе – пашырылі веды слухачоў ШАГа аб інфармацыйнай бяспецы. Сустрэча ж завяршылася, як кажуць, на канструктыве.

Пра сённяшнюю спецыфіку работы друкаваных і электронных СМІ журналісты «Добрушскага краю» расказалі таксама старшакласнікам сярэдніх школ №№ 1 і 3 Добруша.

**Мікалай ЖДАНОВІЧ**
**Фота Яўгена УСЦІНАВА**